ІНІЦЫЯТЫВА

СРОДАК АД ДЭПРЭСІІ

У Магілёўскай вобласці пяць раёнаў аб'ядналіся, каб разам займацца развіццём сваіх тэрыторый

Пілотны рэгіён — гэта Слаўгарадскі, Чэрыкаўскі, Краснапольскі, Быхаўскі і Клічаўскі раёны. На тэрыторыі першых трох (яны найбольш пацярпелі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС) чацвёрты год рэалізуецца праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці, створаная ў рамках Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 235. На жаль, тыя льготы і прэферэнцыі, якія гарантуе Указ, не вельмі ажывілі тут прадпрымальніцкую дзейнасць. Не лепшае эканамічнае становішча ў Быхаўскім і Клічаўскім раёнах. І пілотны праект, які стартаваў летась, якраз і разлічаны на тое, каб палепшыць становішча на тэрыторыі раёнаў. Стаўка робіцца на прыцягненне сродкаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі і задзейнічанне актыўнага насельніцтва.

У кожнага раёна ёсць вопыт работы з грантамі міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Слаўгарад уключыўся ў гэтую дзейнасць з 2007 года. Мясцовы фонд развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра» рэалізаваў за гэты час 21 праект. Тры з іх дапамаглі адрадзіць традыцыі сыраробства ў раёне і нават стварыць адпаведны фестываль. Слаўгарадскі філіял грамадскага аб'яднання «Сяльчанка» даў магчымасць знайсці сваю справу найбольш актыўным жыхарам раёна і ўвасобіў у жыццё два буйныя праекты. Яшчэ чатыры на рахунку спажывецкага кааператыва «Гіжэнскі аграрый» — усе яны маюць адносіны да добраўпарадкавання і арганізацыі самазанятасці грамадзян.

У 2015 годзе аналагічны фонд развіцця сельскіх тэрыторый пад назвай «Старт-Узыход» адкрыўся ў Краснаполлі. На яго рахунку пяць сацыяльна важных праектаў. З іх дапамогай атрымалася захаваць цудоўны помнік прыроды мясцовага значэння — батанічны сад «Іваноў хутар», арганізаваць відэашколу для перспектыўнага бізнесу, аб'яднаць насельніцтва для сумеснага вырошчвання гародніны, стварыць у вёсцы Яноўка хакейную сталіцу раёна і падтрымаць вяскоўцаў у іх жаданні займацца садоўніцтвам.

Над рэалізацыяй праектаў працуе мясцовы фонд развіцця сельскіх тэрыторый Быхаўскага раёна, які адкрыўся каля двух гадоў таму.

Усе гэтыя некамерцыйныя арганізацыі паспяхова супрацоўнічаюць з органамі ўлады ў сферы занятасці і самазанятасці насельніцтва, займаюцца вырашэннем экалагічных і сацыяльных праблем. Па абагульненых звестках, за 2018 год імі прыцягнута і асвоена каля 500 000 еўра, выдзеленых па лініі Еўрапейскага саюза, ПРААН і іншых міжнародных арганізацый. Сродкі дапамаглі рэалізаваць шмат вельмі неабходных і важных для раёнаў праектаў. У аграгарадку Лабанаўка Чэрыкаўскага раёна адкрыўся школьны энергапарк, у Краснаполлі — рэсурсны цэнтр «Энергазберажэнне ў побыце», у Быхаве — «Дом-інтэрнат з нулявымі стратамі энергіі», пры Клічаўскім аграрна-тэхнічным каледжы створаны клас энергаэфектыўнасці. Але такіх рэсурсных цэнтраў не хапае, каб здзейсніць рэвалюцыю ў эканоміцы. Таму і спатрэбілася аб'яднаць высілкі. А заадно больш зладжана працаваць па некалькіх асноўных кірунках. Напрыклад, у моладзі ёсць магчымасць праявіць сябе ў крэатыўнай эканоміцы. Гэта ўсё, што звязана з творчасцю, ІТ-тэхналогіямі, арганізацыяй свят. За апошнія паўтара года ў пяці раёнах створана сем пілотных мадэляў крэатыўных відаў дзейнасці, каля 10 спецыялістаў у кожным раёне працуюць над папулярызацыяй гэтага віду бізнесу, у рэгіён прыцягнута не менш за тры мільёны долараў ЗША. Вельмі перспектыўны турыстычны кірунак. У Слаўгарадскім раёне размешчаны водна-балотны заказнік «Слаўгарадскі», у Клічаўскім — два заказнікі — гідралагічны «Астравы Дулебы» і біялагічны «Свіслацка-Бярэзінскі», у Быхаўскім — ландшафтны заказнік «Старыца». І тут таксама ёсць над чым працаваць.

— Навізна праекта заключаецца ў тым, што ўпершыню ў Беларусі прадугледжваецца ўзаемадзеянне паміж раёнамі ў фармаце мадэльных рэгіянальных праектаў, дзе кожны раён адыгрывае сваю ўнікальную ролю, падае свае рэсурсы, як для сумесных дзеянняў у інтарэсах усяго рэгіёна, так і кожнага раёна паасобку, — кажа **старшыня Слаўгарадскага райсавета дэпутатаў, а па сумяшчальніцтве яшчэ і старшыня каардынацыйнага савета рэгіянальнага праекта Святлана ЯЗЕРСКАЯ.** — Такое ўзаемадзеянне дапаможа нам палепшыць занятасць насельніцтва ў сельскай мясцовасці. А на тэрыторыі пяці раёнаў сёння пражывае больш за 80 тысяч чалавек. Падчас падрыхтоўкі праекта было створана 20 мікрарэгіёнаў, для развіцця якіх распрацоўваюцца 60 ініцыятыў. Ёсць спадзяванні, што 20 будуць падтрыманыя праектам, а на рэалізацыю астатніх пойдуць унутраныя рэсурсы і спонсарскія сродкі. Абноўлены анлайн-сэрвіс і створана смарт-праграма ў выглядзе лічбавай карты для прасоўвання канкурэнтных пераваг рэгіёна. Сфарміраваныя тэматычныя сеткі — сельскі турызм, арганічнае земляробства, саветы вёсак. Распрацаваны тры буйныя праекты ў супрацоўніцтве з міжнароднымі партнёрамі, для 1500 чалавек створаны ўмовы для павышэння самазанятасці ў рэгіёне.

Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК, старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў:

— Пяць раёнаў, якія маюць складаную эканамічную абстаноўку, цяжкасці са сваім развіццём, аб'ядналіся для сумеснага рашэння сваіх ініцыятыў з прыцягненнем грантаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Такі саюз дапамагае кансалідаваць вопыт і веды некалькіх раёнаў і разам выступаць. Гэта дасць магчымасць прыцягнуць больш значныя фінансавыя рэсурсы і стварыць дадатковыя магчымасці для развіцця рэгіёнаў. Актыўна прымаюць у гэтым удзел народныя выбраннікі, раённыя Саветы дэпутатаў.

ВЕДАЙ НАШЫХ

ТУРЫСТ ВЫБІРАЕ... ДЫЕТУ?

Як былая дэпутатка ўзначаліла санаторый і забяспечыла ў Кіраўскім раёне выкананне паказчыка па экспарце турыстычных паслуг

Для любой краіны турысты — гэта дадатковы капітал, магчымасць развіцця канкрэтнай тэрыторыі. Бязвізавы рэжым робіць падарожжа ў Беларусь больш прывабным. На жаль, госці асядаюць у асноўным у буйных гарадах, дзе ёсць што паглядзець, куды схадзіць. Але і на перыферыі таксама пачынаюць набіраць абароты.

Напрыклад, летась Кіраўскі раён выканаў паказчык па экспарце турыстычных паслуг менавіта за кошт санаторыя. Цікава, што ўстанова з'яўляецца структурным падраздзяленнем ААТ «Світанак» імя К. Арлоўскага. А кіраўнік санаторыя, як той казаў, наш чалавек — вопытны **дэпутат і намеснік старшыні райвыканкама па сацыяльных пытаннях у мінулым Вольга ГАРШКОВА *(на фота)***. Дарэчы, свае абавязкі начальніка аздараўленчай установы яна паспяхова спалучае са старшынёўствам у раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Фонд міру». І гэта толькі станоўча адбіваецца на яе асноўнай дзейнасці. Што патрэбна турысту? Нешта ўбачыць, захапіцца і пажадаць вярнуцца. І кіраўніца добра ведае як гэта арганізаваць. Тым, хто ў гэтым бізнесе, напэўна, будзе карысна даведацца як.

— Мы наогул выгадна адрозніваемся ад іншых, бо маем цікавую гісторыю ўзнікнення, — кажа Вольга Гаршкова. — Наш санаторый, напэўна, адзіны ў Беларусі з'яўляецца структурным падраздзяленнем аграгаспадаркі. Яго будаваў для сваіх работнікаў легендарны Герой Савецкага Саюза і Герой Сацыялістычнай Працы Кірыла Пракопавіч Арлоўскі, той самы, пра якога зняты фільм «Старшыня» з Міхаілам Ульянавым у галоўнай ролі. Незвычайны быў чалавек, прафесіянал. Другі корпус, дзе цяпер знаходзяцца ўсе асноўныя памяшканні санаторыя, узводзіў яшчэ адзін наш таленавіты кіраўнік Васіль Канстанцінавіч Старавойтаў. Месцазнаходжанне санаторыя таксама знакавае. У XIX стагоддзі гэта быў цэнтр маёнтка, які належаў фон Гоеру. Захавалася нават яшчэ панская алея, дзе гуляюць нашы адпачывальнікі. За некалькі кіламетраў Жылічы, дзе знаходзіцца палац вядомых беларускіх магнатаў Булгакаў — там зараз ідзе рэканструкцыя. Але паглядзець ёсць што, і мы возім туды турыстаў. А яшчэ ў Мінск, Магілёў і Бабруйск. Але ж мы санаторый, і перш за ўсё і змагаемся за тое, каб кліент атрымаў поўны пералік паслуг, якіх сёння шмат.

Вельмі падабаецца людзям камернасць санаторыя — ён невялічкі, разлічаны ўсяго на 66 месцаў. У планах рэканструкцыя корпуса, які будаваў яшчэ Кірыла Арлоўскі. Плануецца зрабіць там ВІП-нумары і нумары для інвалідаў-калясачнікаў. Дабавіцца яшчэ каля 40 месцаў.

Здраўніца стала папулярнай у замежных турыстаў у 2013 годзе, пасля таго як прадстаўнікі санаторыя пабывалі на выстаўках і турыстычных кірмашах у Маскве, Санкт-Пецярбургу. Сёння тут прымаюць кліентаў з гэтых гарадоў, а таксама з Мурманска, Геленджыка, Ніжневартаўска, Ленінградскай вобласці і іншых. Сюды едуць турысты з Украіны, Германіі, Італіі, Казахстана, Эстоніі, Літвы, Латвіі.

— Мы шчыльна працуем з турыстычнымі фірмамі, расійскіх у спісе каля дванаццаці, — удакладняе суразмоўніца. — Летась больш за 50 % нашых гасцей прыехала з-за мяжы. Але мы захоўваем сваю прыналежнасць і не крыўдзім асноўнага нашага кліента — аграрніка. У снежні адпачывала група кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў. Яны тут і аздараўляліся, і вучыліся — да іх прыязджалі чытаць лекцыі з Мінска, Беларускай сельгасакадэміі з Горак. Потым прыехалі адпачыць механізатары. У іх работа напружаная — і органы дыхання пакутуюць, і пазваночнік. А гэта якраз наш профіль. Падаграваем цікавасць тым, што прапануем нешта новае. Летась, напрыклад, пачалі практыкаваць так званае лячэбнае галаданне. Сёння гэта наша асаблівасць і запатрабаваная паслуга.

— Зараз мала дзе такое прапануюць, — удакладняе **намеснік начальніка па медыцынскай частцы санаторыя Уладзімір КАВАЛЕЎСКІ.** — Афіцыяльна паслуга называецца разгрузачная дыетычная тэрапія. Ёсць людзі, якія жадаюць схуднець, але дома ў іх нічога не атрымліваецца. Нядаўна былі госці з Прыбалтыкі, а да гэтага прыязджалі кліенты з Гродна, Мінска, Еўпаторыі, Ізраіля, ЗША. Наша справа толькі трымаць марку і арыентавацца на попыт.



Вадзім БРЭЖЭЗІНСКІ, начальнік аддзела вучэбна-спартыўнай, арганізацыйнай і турыстычнай работы ўпраўлення спорту і турызму Магілёўскага аблвыканкама:

— Сёння на тэрыторыі Магілёўскай вобласці функцыянуе 56 гасцініц і аналагічных пляцовак размяшчэння, 21 дом паляўнічага і рыбалова, 209 суб'ектаў аграэкатурызму, 27 баз адпачынку, 236 аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, дзевяць санаторна-аздараўленчых устаноў, тры кемперныя пляцоўкі.

Варта адзначыць, што 89 % усяго экспарту турыстычных паслуг вобласці прыпадае на Бабруйск, Магілёў, а таксама Круглянскі, Кіраўскі і Горацкі раёны. Астатнімі васямнаццаццю раёнамі вобласці паказчык выконваецца толькі на 11 %. За апошнія пяць гадоў унёсак раёнаў у экспарт вырас. Калі ў 2012-м Магілёў і Бабруйск давалі 90 % экспарту, то цяпер — 75 %. Сярод асноўных валаўтваральных прадпрыемстваў вобласці значыцца і санаторый ААТ «Світанак» імя К. Арлоўскага.

Матэрыялы падрыхтавала Нэлі ЗІГУЛЯ.